СПРАВАЗДАЧА УРАДА БССР
НА XI УСЕБЕЛАРУСКІМ З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ

Даклад старшыні Совета Народных Камісараў БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕДА 15 студзеня 1935 г.)*

Таварышы, ад X да XI з'езда советаў прайшлі 4 гады. За гэты тэрмін Совецкі Саюз у цэлым, а пад яго кіраўніцтвам і ўсе саюзныя нацыянальныя рэспублікі прайшлі вялікі гістарычны этап на шляху ўздыму соцыялізма.

За гэты час партыя і ўрад праробілі гіганцкую работу. За гэты перыяд адбыліся вялікія соцыяльна-эканамічныя зрухі ў нашай краіне Советаў. Але разам з гіганцкімі дасягненнямі не так даўно нашу дзяржаву напаткала вялікае няшчасце. Партыя, совецкая ўлада, пролетарыят панеслі вялікую ўтрату. Класавы вораг, подлыя падонкі контррэволюцыйнай зіноўеўска-троцкісцкай апазіцыі забілі лепшага сына нашай радзімы, палкага большэвіка-рэволюцыянера — таварыша Кірава. Гэта амрачыла нашы дасягненні. Бо пры іх палвялзенні мы не маем у нашых радах аднаго з выдатных правадыроў рабочага класа і нашай партыі, які працаваў над гэтымі дасягненнямі. Але наша партыя, нашы советы тым і моцны, што яны заўсёды, пры любых стратах не апускаюць рук, не трацяць перспектыў, не трацяць сваёй энергіі, пільнасці, а з яшчэ большай энергіяй прадаўжаюць справу Леніна-Сталіна. У адказ на забойства тав. Кірава ўзнімаюцца новыя мільёны барацьбітоў за соцыялізм.

За гэты час мы мелі пямала падзей і на міжнароднай арэне.

Многа актаў і пактаў заключыў Совецкі Саюз з рознымі краінамі, якія (акты і пакты) накіраваны на справу ўмацавання міру. За гэты час наш Совецкі Саюз вышаў на арэну міжнароднай палітыкі, як самы магутны фактар барацьбы за мір.

1. Аб міжнародным становішчы

Амаль што год таму назад тав. Сталін у сваім дакладзе на XVII партыйным з'ездзе намаляваў параўнаўчы малюнак становішча СССР перад тварам капіталістычнага свету. Год, які аддзяляе нас ад з'езда партыі, цалкам і поўнасцю пацвердзіў ва ўсіх адносінах абсалютную правільнасць характарыстыкі міжнароднага становішча, якая была дана нашым правадыром.

З 1929 года капіталістычны свет б'ецца ў цісках крызіса і да гэтага часу ён не можа дабіцца колькі-небудзь рашаючых зрухаў у бок выхаду з гэтага крызіса.

Буржуазія, як гэта паказаў вопыт апошніх двух гадоў, шляхам палітыкі зніжэння зарплаты, шалёнай эксплаатацыі пролетарыята, абраблення сялянскіх мас і каланіяльных народаў, змагла дабіцца некаторага паляпшэння. Але яна (буржуазія) не здольна стварыць умовы для нармальнага развіцця вытворчых сіл. Шляхам шалёнай надрыхтоўкі да вайны і гонкі ўзбраенняў, патрабуючых мільярдных укладанняў дзяржавы ў прамысловасць, якая занята вырабам прызад і сродкаў вайны, буржуазным урадам некаторых краін, як напрыклад Японіі і Германіі, удалося нават дабіцца пэўных поспехаў у галіне цяжкай прамысловасці. Але гэты ўздым, па-першае, ішоў за кошт развіцця ваеннай прамысловасці, па-другое, ён дасягнут папою выдаткавання на ваенную прамысловасць велізарных грашовых сродкаў, сабраных за кошт неміласэрдна абкладзеных народных мас, — тым самым па сутнасці паскорая выбух новай імперыялістычнай бойні.

У сельскай гаспадарцы капіталістычных краін справа абстаіць яшчэ горш — неўраджай у многіх краінах у 1934 г. даваў надзею капіталістам, але затое ён прывёў да яшчэ большага скарачэння сельскіх даходаў. Разбураюцца мільёны сялянскіх гаспадарак, масы нішчаюць і толькі невялікая верхавіна фермераў і кулакоў трымаецца пры падтрыманні ўрадаў.

Значыць, у сельскай гаспадарцы да гэтага часу няма ніякіх прызнакаў дэпрэсіі, а крызіс прадаўжаецца.

Характарным выражэннем сусветнага крызіса астаецца да гэтага часу масавае беспрацоўе, якое вылічваецца ва ўсім капіталістычным свеце вялікімі дзесяткамі мільёнаў.

Напрыклад, у ЗША лік беспрацоўных складае 12 млн. чалавек, у Англіі лік беспрацоўных (па афіцыяльных даных) перавышае 2 млн. чалавек. У Германіі па афіцыяльных даных лік беспрацоўных складае 3 мільёны чалавек, ва Францыі — 400 чысяч чалавек, у Японіі — 400 тыс. чал. У Польшчы афіцыяльна зарэгістраваных беспрацоўных у снежні 1934 года — каля 400 тыс. чалавек, але па заяве «Газеты варшаўскай» агульная колькасць фактычных беспрацоўных вышэй чым 1 млн. чалавек. Такім чынам беспрацоўе ў капіталістычных краінах стала такой хранічнай з'явай, што агромністыя мільёны людзей пачынаюць забываць, што яны калі-небудзь працавалі.

Тав. Сталін у сваім дакладзе на XVII з'ездзе партыі, гаворачы аб міжнародным становішчы СССР, сказаў: «У абставінах нашай ваеннай сяброўляскі, захапіўшай палы рад краінаў, СССР прадаўжае стаяць гэтым ўсе годы моцна і непахісна на сваіх мірных пазіцыях, ведучы барацьбу з пагрозай вайны, ведучы барацьбу за захаванне міру. Цячы насустрач тым краінам, якія стаяць так ці інакш за захаванне міру, выкрываючы і арыгінуючы маскі з тых, хто надрыхтоўвае нам подлае нападзенне. Правядзіўшы такую палітыку, урад Совета ССР дабіўся таго, што Совецкі Саюз у агромнай ступені ўзмацніў сваё міжнароднае становішча і аўтарытэт. Маючы рост гаспадарчы, культурнай і ваеннай магутнасці СССР, ператварыўшы Совецкі Саюз у адну з самых моцных дзяржаў у свеце, ідучы ўслед дзяржавы, якіяся па тых ці іншых прычынах у захаванні міру, імкнуць збліжэння з СССР.

У апошнія гады 1932-1934 г. СССР падпісаў дагаворы аб ненападзе з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай, Францыяй, Італіяй, Японіяй, ранейшы Саюз падпісаў дагавор аб ненападзе з Літвой, Германіяй, Турцыяй, Персіяй і Афганістанам.

Далей таварыш Сталін сказаў спыніцца на ўзаемаадносінах СССР з асобнымі капіталістычнымі краінамі.

АБ ВАЕННАЙ НЕБЯСПЕЦЫ І ЗАДАЧАХ УЗМАЦНЕННЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦІ СССР

Тав. Сталін, падводзячы вынікі выканання першай пяцігодкі ў чатыры гады на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК ВКП(б) 7 студзеня 1933 г. сказаў нам, што мы ў выніку паспяховага выканання першай пяцігодкі ператварылі СССР з краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны ў краіну магутную ў справе абароназдольнасці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасцей, у краіну, якая можа вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забяспечыць імі сваю армію ў выпадку нападу на нас.

Магутнасць нашай краіны і боездольнасць Чырвонай арміі зараз не адмаўляюць і нашы ворагі. Толькі таму, што мы магутны яны і не напалі на нас дагэтуль. Буржуазныя палітыкі і вялікі капіталізма прымушаны лічыцца з боездольнасцю нашай Чырвонай арміі, гэта відаць з цэлага раду выказванняў як ваенных спецыялістаў капіталістычных краін, так і іншых дзеячоў капіталізма.

Прывяду пару вытрымак зарубежнага друку аб Чырвонай арміі.

Рэдактар «Эко дэ пары» — орган французскага генеральнага штаба — змясціў рад артыкулаў аб Чырвонай арміі аднаго з сваіх рэдактароў, Кірыліса, які пабываў у СССР. Кірыліс асабліва захапляюча апісвае аб совецкай авіяцыі. Ён заяўляе, што совецкая авіяцыя «з'яўляецца трыумфам большэвікоў».

Далей ён піша:

«Рускія на некалькі год абагналі нас у авіяцыі па ўсіх катэгорыях: знішчальнай, бомбардзіровачнай, распазнавальнай, па ўсіх дэталях абсталявання і інструментовак. Яны нас далёка апярэдзілі».

Свой артыкул аб авіяцыі ён канчае наступным:

«Совецкая авіяцыя прадстаўляе для Захада найзначнейшую сілу, здольную адыграць рашаючую ролю».

Цікава прывесці разважанне аднаго нямецкага генерала Кохенгаўзен, які з'яўляецца старшынёй «таварыства ваенных палітыкаў».

Ён змясціў артыкул у журнале «Ост-Еўропа» аб Чырвонай арміі, які ён так заканчвае:

«Увага, паны афіцэры, буржуазных краін Еўропы! Чырвоная армія з'яўляецца грозным працўнікам. Чырвоная армія знаходзіцца ў найлепшых умовах, блескуча абучана і прадстаўляе магутную сілу».

Карысна будзе прывесці і водгук італьянскага генерала Грацыолі, які быў у Саюзе летам мінулага года і прысутнічаў на вучэннях Беларускай ваеннай акругі тут у Менску.

Генерал Грацыолі ў сваёй характарыстыцы асаблівае месца дае палітычнай арганізаванасці Чырвонай арміі. Ён піша: «Сярод выключных фактараў, з якіх Чырвоная армія атрымала карысць, першае месца займае рэволюцыя, утварыўшая дзейнічаючы рэволюцыйны дух пакшталт духу, які быў уласцівы кіраўнікам арміі Напалеона».

Нас, таварышы, зразумела, цікавіць ведаць думку з лагера нашых працўнікаў аб нашай абароназдольнасці. Думкі, як бачыце, для нас прыемныя, але мы не павінны супакойвацца на поспехах. Нам нельга ні на адну хвіліну забываць, што ў любы час вораг можа на нас напасці і мы павінны быць заўсёды гатовы.

Мы прымежная рэспубліка, працуем і будуем соцыялізм на рубяжы з капіталістычным светам. Мы павінны як зяніцу вока берагчы совецкія межы. Уся Совецкая Беларусь павінна і будзе стаяць зоркі на варце совецкіх межаў. (Воплескі).

*) Друкуецца па скарочанай стэнаграме.

II. Вынікі соцыялістычнага будаўніцтва па СССР і па БССР ад з'езда да з'езда

1. АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА па СССР

Наша краіна падыходзіць да свайго з'езда советаў з гіганцкімі перамогамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

СССР з года ў год расце і ўмацняецца, як магутнейшая індустрыяльная краіна свету, з гігантамі соцыялістычнай індустрыі, з высокай тэхнікай.

Валавая прадукцыя прамысловасці па цэнах 1926-27 г. у 1931 г. раўнялася 38,6 млрд. руб.; у 1932 г. — 43,3 млрд. руб.; 1933 г. — 46,9 млрд. руб.; а ў 1934 г. 55,8 млрд. руб.

Прычым найбольшы рост валавой прадукцыі прамысловасці дае цяжкая прамысловасць, прамысловасць групы «А», іменна той групы, якая вырабляе сродкі вытворчасці і выводзіць нашу краіну на шырокі шлях незалежнасці ад капіталістычных краін.

Гіганцкімі тэмпамі пашла вытворчасць трактароў. Калі ў 1930 г. наша прамысловасць давала нам трактароў у год — 12.753 шт., то ў 1934 г. мы выпусцілі 115.300 трактароў.

Такі-ж малюнак і з выпускам аўтамабіляў: з 4.226 шт. у 1930 г. мы давялі выпуск аўтамабіляў у 1934 да 72.000 шт.

У выніку цвёрдай палітыкі ўрада па правядзенню соцыялістычнай індустрыялізацыі — вядучая роля індустрыі СССР з кожным годам павышаецца.

Асабліва грамадзкі нашы дасягненні ў галіне соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Совецкага Саюза.

Як вам вядома, перад намі стаяла задача падтрымання развіцця сельскай гаспадаркі на тэмпаў развіцця нашай соцыялістычнай індустрыі. Вынікі работы за апошнія гады паказваюць, што гэта задача выконваецца з вялікім поспехам. Прыкладам гэтаму з'яўляецца наступнае: калі ўзяць пасеўныя плошчы па Совецкаму Саюзу, то ў 1913 годзе пасеўная плошча складала 105 млн. га, у 1934 г. — 130,1 млн. га.

За гэты час наша партыя і ўрад СССР пад кіраўніцтвам тав. Сталіна праробілі гіганцкую работу па соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па аб'яднанню дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак у буйныя калгасныя гаспадаркі і тым самым сельскую гаспадарку паставілі на рэйкі буйнай гаспадаркі калгасаў, саўгасаў. Па СССР 82 проц. пасеўнай плошчы аб'яднаны ў калгасах і саўгасах.

Поспехі калектывізацыі выяўляюцца яшчэ наступнымі фактамі, што па ўсяму СССР за ліпень месяц 1934 г. было аб'яднана ў калгасы бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак 71,4 проц. Гэта значыць, што ў асноўным калектывізацыя па СССР завершана.

Совецкі Саюз, неадрыўнай часткай якога з'яўляецца наша Совецкая Беларусь, стаў першай у свеце індустрыяльна-высокай дзяржавай, дзяржавай гіганцкай сельскай гаспадаркі, дзяржавай саўгасаў і калгасаў, дзяржавай, дзе ўсе працоўныя масы, уключаючы і працоўнае сялянства, з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі соцыялізма і дзень ў дзень працуюць над умацненнем нашай краіны (воплескі).

2. ВЫНІКІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ПА БССР

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі